интеллектуальной нагрузки такой работы студенты за ее выполнение получили значительное количество баллов, что имеет значение при рейтинговой системе в обучении.

Большим успехом у студентов пользуется работа по созданию презентаций. Здесь требуется не только знание программы PowerPoint, но и умение анализировать материал и подать его в самом выгодном свете.

Подведем некоторые итоги. Сочетание рейтинговой системы и электронных технологий позволяет, с одной стороны, расширить диапазон использования компьютера, с другой – дает толчок развитию интеллектуальных и творческих способностей студентов. Участие студентов в кейс-методе, разработке тренингов, составление контролирующих и дидактических материалов, написание авторских докладов – расширяет их профессиональный кругозор и разнообразие форм и методов обучения.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**І.А. Алексніна**, *дацэнт*

## ШЛЯХІ І МЕТАДЫ АКТЫВІЗАЦЫІ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

(прадмет "Рэжысура")

Існуе дастаткова ўстойлівая думка, што рэжысуры навучыць нельга, але навучыцца можна, таму што гэта прафесія эмпірычная, заснаваная на асабістым (жыццёвым, пачуццёвым, літаратурным, творчым, мастацкім) вопыце, здольнасці да вобразнага мыслення. Не менш рацыянальным у галіне тэатральнай педагогікі ўяўляецца і выказванне К.С. Станіслаўскага аб тым, што "...создать режиссера нельзя – режиссер рождается. Можно создать благоприятную атмосферу, в которой он может вырасти" [1, с. 655]. Аб карыснасці такога падыходу сведчыць і вопыт самога вялікага рэжысёра, педагога і рэфарматара сцэны, які падараваў сусветнаму мастацтву такія імёны, як Ус. Э. Меерхольд, Я. Б. Вахтангаў, М. Чэхаў і інш.

Перад педагогамі кафедры театральнай творчасці БДУ культуры і мастацтваў стаяць дзве найважнейшыя задачы: 1) стварыць такую атмасферу, якая спрыяе паспяховаму авалоданню

неабходнымі прафесійнымі ведамі і навыкамі; 2) дакладна дыягнаставаць патэнцыял студэнта і абудзіць яго творчыя сілы, накіраваць у правільнае рэчышча яго творчую фантазію, паўплываць на фарміраванне і развіццё яго светапогляду як неардынарнай, творчай асобы.

Пры вырашэнні гэтых задач у вучэбным працэсе значнае месца займае самастойная работа навучэнцаў, якая найлепей выяўляе творчую індывідуальнасць і дае магчымасць выкладчыку выбраць найбольш эфектыўныя шляхі і метады свайго ўдзелу ў фарміраванні спецыяліста творчай прафесіі, у тым ліку і шляхам кантролю.

Практычна на самастойных напрацоўках студэнтаў заснавана выкананне такіх вучэбных заданняў, як вядомыя практыкаванні і эцюды: "памяць простых фізічных дзеянняў", на актывізацыю ўвагі, уяўлення, фантазіі, назіральнасці, развіццё вобразнага мыслення. Шмат самастойнай работы патрабуюць і іншыя вучэбныя заданні, такія як стварэнне эцюдаў па літаратурных, жывапісных і музычных творах, правядзенне трэнінгу са студэнтамі-аднакурснікамі, праца над пастаноўкай урыўкаў з празаічных і драматычных твораў, напісанне курсавых работ і, як вынік навучання, напісанне і пастаноўка дыпломнага праекта.

Спрыяюць актывізацыі самастойнай работы студэнтаў на занятках па спецдысцыплінах *дзённікі назірання і чытацкія дзённікі*, якія развіваюць назіральнасць за праявамі жыцця, робяць вучэбны працэс больш мэтанакіраваным, выпрацоўваюць неабходныя для прафесіі самадысцыпліну і імкненне да пастаяннай працы над сабой. Вядзенне *дзённіка назіранняў* вучыць быць больш уважлівым да навакольнага свету, жыццёвых працэсаў, уменням аналізаваць тыповыя і індывідуальныя рысы характару чалавека, яго эмоцыі, пачуцці, інтанацыю, міміку, жэсты, пластыку, касцюм, манеру апранацца або насіць некаторыя дэталі касцюма (капялюш, пальчаткі, парасон), заўважаць адметныя прывычкі, а таксама назапашваць у памяці жыццёвыя "мізансцэны", канфліктныя сітуацыі, дыялогі і інш. Пры вядзенні такога дзённіка неабходна дабівацца лаканічных, канкрэтных вобразна-пачуццёвых запісаў. Матэрыял дзённіка можа аказацца вельмі каштоўным пры падрыхтоўцы вучэбных эцюдаў, міні-спектакляў, акцёрскіх і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэжысёрскіх аповедаў і паказаў, "творчых зачынаў", мэта якіх – сцэнічнае ўвасабленне ўзятых з жыцця сюжэтаў з дзеяннем, звышзадачай, носьбітамі скразнога і контрскразнога дзеяння, канфліктамі, прапанаванымі абставінамі, падзеямі і мізансцэнамі. У гэтых жа дзённіках можна аналізаваць п'есы, спектаклі, тэатральныя прэм'еры, занатоўваць падзеі, якія пакінулі моцны эмацыянальны след у душы.

Прывычка са студэнцкіх год весці *чытацкі дзённік* дапаможа фарміраванню патрэбнасці пастаянна павышаць свой "адукацыйны цэнз" не толькі на працягу навучання ва універсітэце, але і ў далейшым. Да таго ж такі дзённік можа прынесці карысць і ў час экзаменацыйнай сесіі, асабліва калі на яе вынесены шэраг "блізкіх" прадметаў: руская і сусветная літаратура, гісторыя тэатра і інш. Шкада, што вядзенне такіх дзённікаў, калі і мае месца, то абмяжоўваецца першым курсам.

Замацаваліся ў практыцы тэатральных педагогаў такія заданні, як "творчыя зачыны". Гэта заданні, якія выконваюцца ўсімі студэнтамі курса (на жаль, як і дзённікі назіранняў, толькі першага курса) пачаргова ў вольны ад аўдыторных заняткаў час. Яны даюць студэнтам магчымасць паспрабаваць свае сілы ў рэжысуры, акрамя таго, спрыяюць фарміраванню пачуцця адказнасці, актывізацыі ўвагі, назіральнасці, фантазіі, творчага ўяўлення. Тэмы "зачынаў" могуць вар'іравацца ў залежнасці ад педагагічных задач: ад тэм, выбраных студэнтамі самастойна, да тэм, прапанаваных педагогам; ад тэм, узятых са студэнцкага жыцця (універсітэт, сталовая, інтэрнат і інш.), да фантастычных гісторый. Падобныя творчыя студэнцкія паказы надаюць заняткам не толькі творчую актыўнасць, але і забяспечваюць дысцыпліну. Менавіта дысцыпліна гарантуе студэнту-рэжысёру якасць падрыхтоўкі міні-спектакля: правільнае размеркаванне роляў, успрыманне студэнтамі-акцёрамі задач, пастаўленых рэжысёрам, і паспяховае сцэнічнае ўвасабленне спектакля на вучэбнай пляцоўцы.

Тэатральнымі педагогамі недастатковая ўвага ўдзяляецца практыкаванням і эцюдам на творчых занятках са студэнтамі пасля першага года навучання. Працуючы над п'есай (курсавым або дыпломным спектаклем), і педагогі, і студэнты вельмі рэдка карыстаюцца так званым "эцюдным метадам", хоць сусветная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэатральная практыка даказала карысць пастаянных заняткаў практыкаваннямі і эцюдамі ў мэтах падтрымкі і захавання творчай формы і акцёра, і рэжысёра (асабліва ў тэатрах-студыях). Калі К. С. Станіслаўскі і яго паслядоўнікі (у тым ліку і М. В. Кнебель) выкарыстоўвалі "эцюдны метад" як шлях да стварэння сцэнічнага вобраза, то Е. Гратоўскі і А. Васільеў разглядалі практыкаванні і эцюды як самастойны, асобы від (форму) творчасці, які дапамагае акцёру штодзённа (нават пры адсутнасці спектакляў) быць у творчай форме. Гэта практыка можа спатрэбіцца студэнтам у іх будучай прафесійнай дзейнасці – кіраванні тэатральнымі калектывамі, тэатрамі-студыямі.

Падводзячы вынікі, заўважым наступнае. Да асаблівасцей тэатра як віду мастацтва можна аднесці яго прасторава-часавы характар і тое, што гэта – "мастацтва калектыўнае", а галоўнае ў п'есе (тым больш у спектаклі) – раскрыццё чалавечых узаемаадносін праз пэўныя канфліктныя сітуацыі, падзеі ў прапанаваных дакладных абставінах. Навучыцца падобнай пастаноўцы спектакля самастойна нельга. Толькі на індывідуальных, дробнагрупавых, лабараторных і практычных занятках па спецыяльнасці, знаходзячыся пад разумным кантролем педагога-рэжысёра, можна выправіць зробленыя ў час самастойных пошукаў памылкі, зрабіць дакладны ідэйна-тэматычны аналіз п'есы, даць жанравае азначэнне драматычнага твора, вызначыць узаемаадносіны з партнёрам, удакладніць расстаноўку сіл у адпаведнасці з канфліктам, развесці мізансцэны і г. д. Таму і неабходна захаванне ў вучэбным працэсе аўдыторных гадзін па рэжысуры і іншых спецдысцыплінах.

---

1. *Станиславский, К.С.* Статьи. Речи. Беседы. Письма / К.С. Станиславский. – М.,1953. – С. 655.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ